# ЛІХАМАНКА ЗАХОДНЯГА НІЛА — ІНФЕКЦЫЯ ЗУСІМ БЛІЗКАЯ

**ЛІХАМАНКА Заходняга Ніла апошнія месяцы не пакідае стужкі інфармацыйных агенцтваў. З пачатку ліпеня па 31 жніўня на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі быў зарэгістраваны 231 лабараторна пацверджаны выпадак ліхаманкі Заходняга Ніла, у тым ліку 6 смяротных. Самая вялікая колькасць інфіцыяваных (87 працэнтаў ад агульнай колькасці) была выяўлена ў Валгаградскай вобласці. Пры гэтым арэал распаўсюджвання інфекцыі ахоплівае 12 раёнаў вобласці. 30 захварэлых былі выяўлены ў Растоўскай вобласці, асобныя выпадкі інфекцыі фіксаваліся на працягу лета ў Астраханскай і Варонежскай абласцях, у Краснадарскім краі і Калмыкіі. Расіяне ў паніцы. Адкуль у іх з'явілася інфекцыя з такой экзатычнай назвай? Трэба сказаць, што прыкладна 10 гадоў таму такія ж панічныя настроі, выкліканыя наступам новай інфекцыі, ахапілі і жыхароў Еўропы.**

Між іншым, навукоўцам вірус ліхаманкі Заходняга Ніла вядомы ўжо даволі даўно: упершыню ён быў выдзелены ў крыві хворай жанчыны, якая пражывала ў вытоках Ніла, яшчэ ў 1937 годзе. Адсюль пайшла і яго назва. Ліхаманка Заходняга Ніла (ЛЗН) — гэта прыродна-ачаговая арбавірусная інфекцыя. Прасцей кажучы, інфекцыя, якая перадаецца праз укус членістаногіх, у асноўным крывасосных камароў, і якая цяжка паддаецца эпідэміялагічнаму кантролю. Пры дапамозе пералётных птушак вірус ЛЗН здольны пераносіцца на вялікія адлегласці, таму ён паспяхова асвоіў ужо не толькі афрыканскі кантынент, але і краіны Азіі, Еўропы, Амерыкі. У ЗША ліхаманка Заходняга Ніла ахапіла ў 1999 годзе такі мегаполіс як Нью-Ёрк і яго наваколле, а крыніцай распаўсюджвання інфекцыі сталі камары.

Беларусы здзівяцца, напэўна, яшчэ больш за расіян, але вірус ліхаманкі Заходняга Ніла выдзяляецца штогод таксама і ў камароў на тэрыторыі Беларусі. Першая экспедыцыя па выяўленні невядомых раней арбавірусаў была арганізаваная Беларускім навукова-даследчым інстытутам эпідэміялогіі і мікрабіялогіі яшчэ напрыканцы 60-х гадоў XX стагоддзя. Але ў той час была навукова ўстаноўленая цыркуляцыя на тэрыторыі нашай краіны толькі віруса клешчавага энцэфаліту, хоць у суседніх краінах (Польшчы, Літве, Украіне) выдзяляліся ўжо і іншыя арбавірусы. А першы штам віруса ЛЗН быў атрыманы толькі ў 1985 годзе пры даследаванні ўнутраных органаў пералётных птушак: усяго былі даследаваныя 62 біяпробы, здабытыя ўздоўж штучных вадаёмаў рыбгаса «Трэмля», што ў Петрыкаўскім раёне. Пазней штам віруса ЛЗН быў выдзелены ў камароў роду Aedes, адлоўленых на тэрыторыі Белавежскай пушчы, і ў крыві хворага, які таксама пражываў на тэрыторыі Белавежскай пушчы.

Паколькі вірус ліхаманкі Заходняга Ніла цеплалюбівы, то ў нашай краіне Гомельская і Брэсцкая вобласці з'яўляюцца найбольш спрыяльнай кліматычнай зонай для цыркуляцыі там віруса ЛЗН. На тым жа Беларускім Палессі маюцца ўсе ўмовы для стварэння там стабільных прыродных ачагоў ліхаманкі Заходняга Ніла. Хоць у зону цыркуляцыі віруса ЛЗН уваходзіць уся тэрыторыя Беларусі, спецыялісты сцвярджаюць, што прычын для панікі ў беларусаў няма, але і недаацэньваць небяспеку нельга, бо камары-разносчыкі віруса ЛЗН жывуць у непасрэднай блізкасці ад чалавека: месцамі іх размнажэння становяцца прыбярэжныя забалочанасці рэк, прыродныя і штучныя вадаёмы, якія стварае чалавек (ямы, канавы, кар'еры, цыстэрны, бочкі з дажджавой вадой, падвалы жылых будынкаў, хлявы і свірны).

Зразумела, што ёсць у Беларусі і людзі, якія перахварэлі на «афрыканскую» ліхаманку, не пакідаючы яе межаў. Антыцелы да віруса ЛЗН выяўляліся ў крыві жыхароў усіх абласцей Беларусі. Але для таго, каб паставіць такі дыягназ, неабходна лабараторна яго пацвердзіць. Увогуле большасць арбавірусных інфекцый праходзяць у медыцынскай справаздачнасці пад іншымі дыягназамі — «вострая рэспіраторная вірусная інфекцыя», «неўрыт тварнага нерва», «пнеўманія», «серозны менінгіт» і г.д., паколькі іх клінічная карціна сцёртая, а сімптомы ЛЗН нагадваюць сімптомы прастуды. Па сучасных звестках каля 80 працэнтаў выпадкаў інфіцыявання ЛЗН працякаюць увогуле бессімптомна або ў лёгкай форме, таму рэальная колькасць інфіцыяваных у той жа Валгаградскай вобласці невядомая. І толькі каля 20 працэнтаў людзей праз 3-14 дзён пасля ўкусу інфіцыяванага камара адчуваюць пад'ём тэмпературы цела, дрыжыкі, галаўныя, мышачныя і сустаўныя болі. Зрэдку да гэтых сімптомаў далучаюцца млоснасць і ваніты, у хворых павялічваюцца лімфатычныя вузлы, а на целе з'яўляецца сыпка. Чалавек адчувае сябе як пры захворванні на грып ці іншыя вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі. Такі стан можа доўжыцца ад некалькі дзён да (радзей) некалькіх тыдняў, пасля чаго паступова знікае.

Толькі ў аднаго з прыкладна 150 інфіцыяваных вірус пранікае ў цэнтральную нервовую сістэму з развіццём так званай нейраінвазіўнай формы захворвання. Пры гэтым можа пашкоджвацца як сам мозг (энцэфаліт), так і яго абалонкі (менінгіт). Пры гэтай форме інфекцыі моцная гарачка суправаджаецца выражанымі неўралагічнымі сімптомамі, інтэнсіўным галаўным болем, дэзарыентацыяй, мышачнай слабасцю, сутаргамі, зніжэннем адчувальнасці, парушэннямі свядомасці аж да комы. Зрэдку — пашкоджаннем сасудзістай абалонкі і сятчаткі вачэй аж да поўнай страты зроку.

На жаль, але пры інфіцыяванні ЛЗН магчымы і лятальны зыход. Цяжкасць працякання хваробы і лятальнасць напрамую залежаць ад узросту чалавека і стану яго імуннай сістэмы. Па звестках Расспажыўнагляда, большасць захварэлых на ліхаманку Заходняга Ніла ў гэтым годзе звязваюць сваё інфіцыяванне з працай на прысядзібным участку або з адпачынкам на прыродзе. Дзяржаўны санітарны ўрач Расійскай Федэрацыі Генадзь Анішчанка звязаў успышку ліхаманкі Заходняга Ніла гэтага года з анамальна цёплым надвор'ем, якое стварыла спрыяльныя ўмовы для размнажэння камароў — пераносчыкаў віруса. Адразу пасля ўспышкі валгаградская абласная санэпідслужба пачала рапартаваць аб дэзінсекцыі вадаёмаў і затопленых падвалаў, што дапамагло знізіць колькасць камароў, якая цяпер ужо не перавышае шматгадовыя паказчыкі.

Аднак паколькі пацяпленне клімату назіраецца ўжо не першы год, а камары пераносяць не толькі вірус ліхаманкі Заходняга Ніла, то ў прафілактыцы «камарыных інфекцый» насельніцтву трэба спадзявацца і на ўласныя сілы. Галоўная прафілактыка заключаецца ў зніжэнні кантакту з крывасмокамі. Для гэтага трэба рэгулярна апрацоўваць адкрытыя ўчасткі цела рэпелентамі, а на вокнах і фортках устанавіць маскітныя сеткі. Акрамя таго, уладальнікі загарадных участкаў могуць дапамагчы скараціць колькасць камароў, лічынкі якіх пладзяцца ў стаячай вадзе. Для гэтага трэба трымаць басейны, бочкі і іншыя ёмістасці з вадой закрытымі, не дапускаць на сваіх участках працяглага існавання лужын і своечасова прачышчаць вадасцёкі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

---

## Гіпертонікам на заметку

### ЛЕКАВЫЯ КАНІКУЛЫ АДМЯНЯЮЦЦА!

**Шмат у каго ўзнікае пытанне, чаму трэба дакладна выконваць рэкамендацыі ўрача. Чаму, калі наступіла паляпшэнне, неабходна працягваць прыём прэпаратаў у агаворанай дазіроўцы? Ці не пашкодзіць гэта здароўю?**

Па-першае, перажываць вам няма за што. Мноства людзей ва ўсім свеце штодня прымае лекі, і гэта не прыводзіць да страты працаздольнасці або зніжэння якасці іх жыцця.

Па-другое, сістэматычны прыём прэпаратаў істотна зніжае рызыку ўзнікнення інфарктаў і інсультаў на фоне гіпертанічнай хваробы. Варта яшчэ раз адзначыць, што высокі ціск павышае верагоднасць развіцця названых ускладненняў.

Па-трэцяе, ніколі не займайцеся самастойнай карэкціроўкай лекавага курсу. Гэта датычыцца і дазіровак, і частаты, і працягласці прыёму. Рэч у тым, што некаторыя прэпараты пры іх адмене або няправільным прымяненні (клафелін, напрыклад) даюць адваротны эфект, і ціск можа пачаць бескантрольна падымацца. Таму змяненне прыёму аднаго з іх можа выклікаць непажаданыя пабочныя эфекты з боку іншага.

### ЦІ ХАДЗІЦЬ У ЛАЗНЮ ГІПЕРТОНІКУ?

**Пагроза ўзнікнення сур'ёзных адмоўных рэакцый і цяжкіх наступстваў у выніку самавольнага і бескантрольнага карыстання лазняй людзьмі з парушэннямі дзейнасці сардэчна-сасудзістай сістэмы прымусіла вучоных распрацаваць спецыяльныя правілы.**

У іх падкрэсліваецца, што карыстанне парылкай дапускаецца, галоўным чынам, здаровым людзям, астатнія ж, хто мае якія-небудзь адхіленні ў стане здароўя, могуць наведваць парныя і саўны толькі з ведама свайго ўрача пад пастаянным медыцынскім кантролем за іх здароўем.

Тэмпература ў парных пры вільготнасці паветра больш за 80 % не павінна перавышаць 50 градусаў, а ў саўне пры вільготнасці 10—15 % — не больш за 60—90 градусаў. Пры першым наведванні працягласць знаходжання ў парыльным аддзяленні для здаровых асобаў абмяжоўваецца 5—8 хвілінамі, для хворых — назначэннем урача. Пасля знаходжання ў парылцы абавязкова адпачніце на працягу 30—50 хвілін, седзячы або лежачы, у памяшканні, якое добра праветрываецца.

Выключна небяспечна карыстацца парыльняй у нецвярозым стане, сытна пад'еўшы, у стане моцнай стомленасці. На думку многіх даследчыкаў, саўна аказвае гіпатэнзіўнае дзеянне ў хворых на артэрыяльную гіпертанію, але пры гэтым можа павялічвацца вязкасць крыві і агрэгацыя трамбацытаў, інакш кажучы, адбываецца «згушчэнне крыві», што можа ўяўляць некаторую пагрозу пры спадарожным атэрасклерозе.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

---

## Дзіцячая тэма

# Цяжкая справа — пачаць школьнае жыццё...

**Ці ведаеце вы, што нашы малыя сталеюць гэтаксама хутка, як мы старэем. Яны становяцца больш дапытлівымі і скрытнымі, асабліва гэта датычыцца сямігадовых дзяцей. Уступіўшы ў новую фазу сталення, яны, натуральна, адчуваюць сябе не зусім камфортна, бо пачынаюць больш давяраць не сваёй любімай маме або бабулі, а аднакласнікам і першай настаўніцы. Гэта цалкам заканамерны фізіялагічны працэс.**

Тыя бацькі, якія разумеюць гэта і не абмяжоўваюць дзіця, вылучаючы толькі свой аўтарытэт, не страчваюць узаемаразумення з дзіцем. Аднак бываюць выпадкі, калі бацькі не могуць наладзіць стасункі са сваім дзіцем, якое стала больш дарослым. У такім разе варта звярнуцца да спецыяліста. Парады псіхолага бацькам першакласнікаў дапамогуць не толькі знайсці агульную мову з імі, але і аднавіць даверныя адносіны.

Вельмі важна, каб так званы крызіс сямі гадоў не зацягнуўся надоўга. Для гэтага бацькам трэба быць надзвычай уважлівымі не толькі да паводзінаў свайго дзіцяці, але і да сваіх учынкаў.

**НАЙБОЛЬШ ПРОСТЫЯ І ЛЁГКА ВЫКАНАЛЬНЫЯ ПАРАДЫ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ:**

- не варта навязваць сваё меркаванне ў дачыненні да новых сяброў, тым больш, калі яно адмоўнае, трэба паспрабаваць зразумець, чаму дзіця выбрала сяброўства з дрэннымі аднагодкамі, а не з добрымі;
- непажадана ўваходзіць у пакой без стуку, бо дзіця хоча быць гаспадаром у сваёй «прасторы», а не госцем;
- не абмяжоўвайце дзіця ў выбары гуртка па інтарэсах. Няхай лепш яно паходзіць месяц і само зразумее, што яму гэта не падабаецца, чым пасля 3—5 гадоў наведвання вамі выбранага гуртка высветліцца, што яно не пераносіла той род дзейнасці, якім займалася гэтулькі гадоў;
- заахвочвайце яго дасягненні, але не захвальвайце, інакш яго самаацэнка можа стаць занадта завышанай;
- дапамажыце яму адчуваць сябе свабодным, але пры гэтым раскажыце, што дазволена, а што не;
- не ўмешвайцеся ў справу, якой заняты ваш першакласнік, калі ён не просіць дапамогі;
- не параўноўвайце хлопчыкаў і дзяўчынак, не стаўце адных у прыклад другім: яны розныя нават па біялагічным узросце — дзяўчынкі звычайна старэйшыя за аднагодкаў-хлопчыкаў; не забывайце, што хлопчыкі і дзяўчынкі па-рознаму бачаць, чуюць, па-рознаму ўспрымаюць прастору і арыентуюцца ў ёй, а галоўнае — па-рознаму асэнсоўваюць усё, з чым сутыкаюцца ў гэтым свеце;
- пастуова, але няўхільна знімайце з сябе клопат і адказнасць за асабістыя справы дзіцяці і перадавайце іх яму;
- не бойцеся паказаць сваю «слабасць», паскардзіўшыся на стомленасць або дрэннае самаадчуванне. Дайце дзіцяці магчымасць падагледзець вас, праявіць клопат і ўвагу;
- дазваляйце дзіцяці адчуць адмоўныя наступствы сваіх дзеянняў (або сваёй бяздзейнасці). Толькі тады яно будзе сталець і станавіцца «свядомым».

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
### по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

| Наименование предмета аукциона | Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская область, Малоритский район, дер. Луково, ул. Мокранская, д. 4 |
| Продавец недвижимого имущества | РУППС «Белпочта», тел. 8(0162) 20 57 21 |
| Сведения о предмете аукциона | Капитальное строение (отделение почтовой связи с пристройкой и верандой, сараем, уборной) общей площадью 116,4 кв.м, 1 эт., сборно-щитовое, г.п. 1976. Земельный участок площадью 0,0886 га, использовать для обслуживания объекта коммунального производства, размещения общественного питания, торговли, услуг и других целей, не запрещенных законодательством с соблюдением природоохранных, экологических, противопожарных и других условий; срок аренды – 50 лет. |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 40 259 059 |
| Сумма задатка, руб. | 4 025 900 |
| Организатор аукциона | *Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11, тел. (0162) 23 44 06, 21 19 82, 23 12 63, 20 87 85, 23 44 78 www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by* |

**Аукцион состоится 12 октября 2010 года в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524.**

**Для участия в аукционе представляются:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – 11.10.10 г. включительно.

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

6. Представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

***Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 11 октября 2010 года включительно.***

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ

### ВЕРХНЕДВИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**проводит открытый аукцион на право заключения договора аренды земельного участка, который состоится 15 октября 2010 г. в 15.00 в здании Верхнедвинского райисполкома по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1 (малый зал заседаний, 2-й этаж)**

**На аукцион будет выставлен:** земельный участок с кадастровым номером 221089204601000016, расположенный по адресу: Витебская область, Верхнедвинский р-н, Чапаевский с/с, д. Залучье У-1, площадью 0,2049 га, для размещения базы промыслового лова рыбы, срок аренды – 99 лет, начальная цена предмета аукциона – 33 506 рублей, размер задатка – 3 300 рублей.

**Условия продажи:** внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; заключение победителем аукциона с Верхнедвинским районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и обращение в двухмесячный срок со дня получения решения (выписки из решения) о предоставлении ему земельного участка в установленном порядке за государственной регистрацией права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

**Для участия в аукционе приглашаются** граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица (далее – участники). Участнику необходимо подать заявление на участие в аукционе, заверенную копию платежного поручения о внесении задатка. Кроме того, в комиссию **представляются:**

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

- представителям гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв с 13.00 до 14.00) с 10 сентября по 11 октября 2010 г. (включительно) по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1, кабинет 64. Заключительная регистрация участников 15 октября 2010 г. с 14.00 до 14.45 по тому же адресу. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.**

Сумма задатка перечисляется на р/счет 3641313000610 в ЦБУ № 206 филиала № 214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новополоцка, МФО 660. Получатель – Верхнедвинский райисполком. УНП 300063038. Назначение платежа 04002.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

Инженерные коммуникации на земельном участке отсутствуют.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка внести плату за предмет аукциона, возместить расходы по размещению настоящего извещения в СМИ.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

**Контактный телефон в г. Верхнедвинске: 8 (02151) 5 28 97.**

---

## РАКОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ (Продавец)

**проводит открытый аукцион по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:**

**лот № 1** — земельный участок в агрогородке Раков, участок № 92 площадью 0,2372 гектара, кадастровый номер участка 622085715632000139, начальная цена 23 720 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Готовится проект уличных сетей (электричество, дорога, водопровод), в населенном пункте имеется газ;

**лот № 2** — земельный участок в д. Дубоши, площадью 0,1561 га, кадастровый номер 622085705601000043, начальная цена 3 902 500 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удаленность от центра агрогородка Раков 10 километров, находится в начале населенного пункта, на границе участка имеется искусственный водоем, электричество, асфальтированный подъезд.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется квитанцией на расчетный счет госказначейства № 3600614140501 Главное управление МФ РБ по Минской области в ЦБУ № 605, г. Воложин, филиал № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600537220. Код платежа 04901.

Аукцион состоится **15 октября 2010 года в 10.00** по адресу: а/г Раков, площадь Свободы, 11, 2-й этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются до 11 октября 2010 года (включительно) до 17.00 по адресу: а/г Раков, пл. Свободы, 11, кабинет управляющего делами исполкома.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

Контактные телефоны: (8 01772) 52 2 36; 8 029 140 54 37.

222365, Раковский сельский исполнительный комитет.

Минская область, Воложинский район, агрогородок Раков, площадь Свободы, д. 11.

р/с 3604060502122 в ЦБУ № 605 г. Воложина ф-л № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601.

г. Воложин, ул. Партизанская, 13

УНП 600037384, ОКПО 04432323.

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
### по продаже объектов республиканской собственности – капитальных строений и права заключения договоров аренды земельных участков, изолированных помещений

| | |
|---|---|
| **Лот № 1** Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке | Капитальные строения инв. № 420/С-30936, инв. № 420/С-30937, инв. № 420/С-30938, инв. № 420/С-30939, инв. № 420/С-30337, инв. № 420/С-30338, инв. № 420/С-30340, расположенные по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, 51, здание хранилища техники южнее г. Лиды, военный городок № 2 «Южный», и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 423684000013000023 площадью 1,4618 га сроком на 50 лет |
| | Начальная цена предмета аукциона – 171 605 055 руб., сумма задатка – 17 160 000 руб. |
| **Лот № 2** Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке | Капитальные строения инв. № 420/С-31498, инв. № 420/С-31496, инв. № 420/С-31497, инв. № 420/С-32179, многолетние насаждения, расположенные по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, южнее г. Лиды, военный городок № 2 «Южный», и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 423684000013000006 площадью 2,5797 га сроком на 50 лет |
| | Начальная цена предмета аукциона – 1 151 081 920 руб., сумма задатка – 115 108 000 руб. |
| Продавец недвижимого имущества **по лотам 1, 2:** Государственное учреждение «Барановичское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» | |
| **Лот № 3** Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке | Капитальное строение инв. № 450/С-1714, расположенное по адресу: Гродненская обл., г. Слоним, ул. Гнидаша, д. 3, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 425450100001006857 площадью 0,1339 га сроком на 10 лет |
| | Начальная цена предмета аукциона – 134 208 242 руб., сумма задатка – 13 420 000 руб. |
| | Продавец недвижимого имущества: Департамент охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь |
| **Лот № 4** Предмет аукциона, место нахождения имущества | Изолированное помещение инв. № 441/D-1136, расположенное по адресу: Гродненская обл., Ивьевский р-н, д. Трабы, ул. Советская, д. 35а-1 |
| | Начальная цена предмета аукциона – 8 389 724 руб., сумма задатка – 838 000 руб. |
| | Продавец недвижимого имущества: Гродненское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация» |
| **Лот № 5** Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке | Капитальные строения инв. № 441/С-443, инв. № 441/С-9520, инв. № 441/С-9521, инв. № 441/С-9524, расположенные по адресу: Гродненская обл., Ивьевский р-н, дер. Геранены, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 422980702601000232 площадью 0,2848 га сроком на 50 лет |
| | Начальная цена предмета аукциона – 134 377 457 руб., сумма задатка – 13 437 000 руб. |
| **Лот № 6** Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке | Капитальные строения инв. № 452/С-180, инв. № 452/С-181, инв. № 452/С-182, инв. № 452/С-183, инв. № 452/С-184, инв. № 452/С-5501, инв. № 452/С-5503, инв. № 452/С-5504, инв. № 452/С-5505, инв. № 452/С-5506, инв. № 452/С-5507, инв. № 452/С-5508, инв. № 452/С-5509, инв. № 452/С-5510, инв. № 452/С-5511, инв. № 452/С-5518, оборудование, расположенные по адресу: Гродненская обл., г.п. Зельва, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 422655100000000158 площадью 5,3514 га сроком на 50 лет |
| | Начальная цена предмета аукциона – 158 733 129 руб., сумма задатка – 15 873 000 руб. |
| **Лот № 7** Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке | Капитальное строение инв. № 422/С-430, расположенное по адресу: Гродненская обл., г.п. Островец, ул. Ленинская, д. 77, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 424655100001001581 площадью 0,0054 га сроком на 50 лет |
| | Начальная цена предмета аукциона – 1 084 507 руб., сумма задатка – 108 400 руб. |
| **Лот № 8** Предмет аукциона, место нахождения имущества | Изолированное помещение инв. № 442/D-133, расположенное по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, г.п. Островец, ул. Ленинская, д. 77 |
| | Начальная цена предмета аукциона – 15 657 761 руб., сумма задатка – 1 565 000 руб. |
| Продавец недвижимого имущества **по лотам 5, 6, 7, 8:** Республиканское унитарное предприятие «Белорусский радиотелевизионный передающий центр» | |
| **Организатор аукциона:** Гродненский областной территориальный фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней), тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82; www.region.grodno.by, www.gki.gov.by | |

1. Аукцион состоится **20 сентября 2010 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами принимаются Организатором аукциона **по 16 сентября 2010 года до 13.00**, кабинет 6.

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549.

3. **По лотам 1, 2, 3, 5, 6, 7:** Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

4. **По лотам 4, 8**: Возмещение затрат на организацию и проведение результативных торгов осуществляется победителем торгов (претендентом на покупку) по фактическим затратам. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан перечислить в республиканский бюджет указанную сумму фактических затрат в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. После предъявления копии платежных документов о перечислении затрат на организацию и проведение торгов в установленном порядке в соответствии с условиями торгов между продавцом и победителем торгов (претендентом на покупку) в течение 2 рабочих дней заключается договор купли-продажи предмета торгов.

5. **Подробная информация** – в извещениях о проведении аукционов, ранее опубликованных в газете «Звязда» **21 июля 2010 г. № 140 (26748), 27 июля 2010 г. № 144 (26752), 3 августа 2010 г. № 149 (26757).**

---

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 4 кастрычніка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць міксер, кухонную ЭЛ-машыну, тэлевізар або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **7 кастрычніка 2010 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 16 кастрычніка 2010 г.**

Дастаўку тэлевізараў і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 31 снежня 2010 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года і пашпарта. **Пасля 31 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 01.09.10 г.

**Тэрмін правядзення гульні — з 1.09.10 па 31.12.10.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1754 ад 27.08.10, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

## 4 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________

______________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ______________________
(аддзяленне сувязі)

______________________ **на IV кв. або 2-е паўг. 2010 года**

**Хатні адрас і тэлефон** [ ] ______________________
(індэкс)

______________________

______________________

**Удачы ў розыгрышы!**

---

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ на газету**

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2010 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету**

ПВ | месца | літар

(індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | ______ руб. | Колькасць камплектаў | |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ______ руб. | | |

на 2010 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)